Камуністычная партыя (большавікоў) Беларусі

Смерць нямецким акупантам!

Калгаснік
КОПЫЛЬШЧЫНЫ

№ 16 (1769)
панядзелак
10 красавика 1944 г.

Орган Копыльскага РК КП(б)Б.

**Гераичная Чырвоная Армия идзе к нам. Яна нясе беларускему народу выратаванне, свабоду, радаснае и шчаслівае жыццё. Час перамоги близак! Перамога будзе за нами!**

# ЗВАРОТ

## К НАСЕЛЬНИЦТВУ ЧАСОВА АКУПИРАВАНЫХ РАЁНАЎ СОВЕЦКАЙ БЕЛАРУСИ

### АД СОВЕТА НАРОДНЫХ КАМИСАРАЎ БЕЛАРУСКАЙ ССР, ПРЭЗИДЫУМА ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА БЕЛАРУСКАЙ ССР И ЦЭНТРАЛЬНАГА КАМИТЭТА КП(б) БЕЛАРУСИ

**Дарагия таварышы! Рабочыя, сяляне, усе працоўныя часова акупираваных нямецкими захопникамі раёнаў Совецкай Беларуси!**

Пад ударами доблеснай Рабоча-Сялянскай Чырвонай Армии, кируемай Вярхоўным Галоўнакамандуючым Маршалам Совецкага Саюза таварышам **Сталинам**, гитлераўския полчышчы адкатваюцца усё далей на захад, несучы велизарныя страты у техницы и жывой силе. Чырвоная Армия прайшла на захад мясцами да 2-х тысяч километраў.

Амаль поўнасцю вызвалена ад нямецких захопникаў Совецкая Украина. Такcама идзе масавае выгнанне гитлераўцаў з прэдзелаў нашай роднай Беларуси. Наступаюць радасныя дни вызвалення ўсёй Совецкай Беларуси з-пад гнёта нямецких катаў и разбойникаў. Ужо амаль поўнасцю вызвалены ад нямецких захопникаў Палеская, Гомельская обласци, вызвалена многа раёнаў Магилеўскай и Вицебскай абласцей. Пачалося вызваленне Совецкай Малдавии и Прыбалтыйских Совецких рэспублик.

26 сакавика 1941 года гераичная Чырвоная Армия атрымала яшчэ адну слаўную перамогу. Разгромливаючы нямецких захопникаў и развиваючы наступленне, войски Чырвонай Армии выйшли на дзяржаўную границу СССР.

Близак дзень, кали уся наша Совецкая зямля будзе поўнасцю ачышчана ад гитлераўскай нечысци. Больш двух з палавинай гадоў крывавыя нямецкия душагубы цярзаюць Совецкую Беларусь. Няма такога злачынства, перад якім застанавилися-б крывавыя нямецка-фашысцкия каты. Немцы зверски забили сотни тысяч ни у чым нявинных людзей. Яны спальваюць нашых людзей, напаўняюць калодзежы трупами нашых дзяцей. Яны атруляюць насельництва, заганяюць яго на минныя палі и узрываюць там, морaць людзей голадам у канцэнтрацыйных лагерах, гоняць у Германию, дзе наш народ гине на катаржных работах. Нямецкия захопники паляць беларуския гарады и вёски. Яны пакрыли Беларусь руинами и магилами. Адчуваючы свой прадсмяротны час и знаючы, што им няма прашчэння за усе крывавыя злачынствы, нямецкия изверги канчаткова асатанели.

Цяпер яны задумали новыя планы жудасных злачынстваў супроць беларускага народа, яны аб'явили мабилизацыю мужчынскага насельництва Беларуси. Нямецкия разбойники хочуць па мабилизацыи сабраць найбольш здаровае беларускае насельництва, каб затым знишчыць яго. Для гэтага яны у многих мясцах Беларуси и Польшчы устроили лагеры смерци, куды заганяюць тысячами сабраных пад рознымі прадлогами людзей, у тым лику „па мабилизацыи", тысячами штодзенна знишчаюць голадам або душаць газами, а пасля спальваюць. Вось, напрыклад, только на-днях 22 сакавика 1944 года у вёсцы Азарычы, Палескай обласци, наступаючыя войски Беларускага фронта пад камандаваннем генерала армии таварыша **Ракассоўскага** адбили у немцаў таки лагер смерци, у якім было заключана 33.434 чалавеки беларускага насельництва. Людзи знаходзилися пад адкрытым небам, галодныя, абарваныя, голыя. К дню вызвалення у гэтым лагеры было ужо звыш 900 трупаў совецких грамадзян, памёршых ад голада и замерзшых. Дзесятки тысяч жанчын, дзяцей, старыкоў были асуджаны на пакутную смерць ад якой их спасла наша доблесная Чырвоная Армия.

Такую долю нямецкия каты рыхтуюць усим, загнаным па мабилизацыи. Нямецкия захопники не асмелилися ад сябе аб'явиць мабилизацыю. Нямецкия каты знаюць, што яны акружаны усенароднай ненависцю. Яны знаюць, што ни адзин чалавек у Беларуси нямецким загадам не падчыняецца. Каб абмануць хоць каго небудзь з беларусаў, нямецкае гестапо прыдумала шырму и назвала гэту шырму „радай". Гэта так называемая „рада" и

Працяг на 2-й старонцы

# К НАСЕЛЬНИЦТВУ ЧАСОВА АКУПИРАВАНЫХ РАЁНАЎ СОВЕЦКАЙ БЕЛАРУС

(ПРАЦЯГ ЗВАРОТА)

падписвае бумажки, якия складае нямецкае гестапо. Дза в палавинай гады шукали гитлераўцы у Беларуси якога небудзь здрадника, яки-б служыу для их шырмай и падписвау загады ад якой небудзь „рады" або „самапомачы", або яшчэ ад каго небудзь. Никто з беларуских людзей не пайшоу на службу к немцам. Тады яны прывезли з Берлина Астроускага. Хто ён? Гэта слуцки памешчык, потым дзеникински афицэр; пасля разгрома Дзеникина уцёк у Польшчу и паступиу на службу у дэфензыву—польскую тайную палицыю, якая зрабила яго дэпутатам Польскага Сейма. Гэты „дэпутат" прадавау Польшчу Германии, а потым адкрыта перайшоу на бок Германии. Вось цяпер яго и прывезли з берлинскага звярынага запаведника, каб ён изабражау сабою раду и памагау немцам знишчаць беларускае насельництва.

**Таварышы!** Не паддавайцеся ни на якия нямецкия праваканцыи. Не давайце сябе абмануць. Помните што такое мабилизацыя, якую праводзяць немцы пад шырмай „рады", накираванай на физычнае знишчэнне беларускага народа. Усими силами и сродками зрывайце крывавы план гитлераўцау. Скрывайцеся, не з'яуляйцеся на зборныя пункты. Идзице пад ахову партызан. Уступайце у рады партызан. Помсцице нямецким людаедам за пралитую кроу и слёзы беларускага народа и за знишчэнне нашых сёл и гарадоу, за разграбленне дамашних ачагоу, за забойства цилу чым нявинных жанчын, дзяцей, старыкоу, за угон нашых братоу и сёстрау у нямецкае рабства.

**Партызаны и партызанки!**

Дапамагайце насельництву ухиляцца ад нямецкай мабилизацыи. Растлумачвайце усим, што аб'яуленая гитлераўцами мабилизацыя—новы крывавы план физычнага знишчэння беларускага народа.

Абараняйце наш народ усими силами и сродками. Заклыкайце, арганизоувайце народ на узмацненне усенароднай партызанскай барацьбы з нямецкими захопниками. Знишчайце каманды, зганяючыя народ на зборныя пункты. Грамице зборныя пункты. Нападайце на штабы и гарнизоны працивуника, грамице яго тылы, разрушайце яго камуникацыи и сувязь. Пазбауляйце яго магчымасци падцягваць рэзервы к фронту. Дзейничайце смела и рашуча. Знайце, што Вам на выручку идзе Чырвоная Армия. Зараз перамога близка, як николи.

Чырвоная Армия знаходзицца ля границы Румынии. Яна уступила у Карпаты. Наступленне Чырвонай Армии усё узрастае.

Людския рэзервы Германии вычарпаны. Авияцыя нашых саюзникау б'е немцау днём и ноччу. Италия ужо кинула Германию и перайшла на бок саюзникау. Румыния, Венгрыя и Финляндыя шукаюць шчылины, куды-б запаўзци и уйци ад адказнасци, якую яны немивуча павинны панесци разам з Германияй.

Гераичная Чырвоная Армия идзе к Вам. Яна нясе беларускаму народу вызвалнне, свабоду, радаснае и шчаслива жыццё. Час перамоги близак. Перамога будзе за нами!

**Няхай жыве гераичны беларуски народ!**

**Няхай жыве наша слаўная непераможная Чырвоная Армия!**

**Няхай жывуць нашы адважныя партызаны и партызанки!**

**Няхай жыве свабодная Совецкая Беларусь!**

**Няхай жыве наш правадыр и арганизатар перамог Маршал Совецкага Саюза таварыш Сталин!**

**Смерць нямецким захопникам!**

**Старшыня Совнаркома БССР—ПАНАМАРЭНКА.**

**Старшыня Прэзидыума Вярхоунага Совета БССР—НАТАЛЕВИЧ.**

**Сакратар ЦК КП(б) Беларуси—КАЛИНИН.**

# НА ФРАНТАХ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ

На працягу 6, 7, 8 и 9 красавика на заход ад горада Окала нашы войски вяли баи па знишчэнню акружанай групироуки немцау.

На Кишынеуским напрамку нашы войски авалодали уездным цэнтрам Малдаускай ССР г. Оргеев.

Войски 1-га Украинскага фронта, нанёсшы паражэнне працивуники у прадгор'ях Карпат, вышли на нашу дзяржаўную границу з Чэхаславакияй и Румыняй па фронту працягам да 200 клм. и заняли на румынскай тэрыторыи г. Серет и 30 других населеных пунктау.

Войски 2-га Украинскага фронта фарсиравали раку Прут, паунучней горада Яссы, на участку працягам у 170 клм., вышли на раку Серет и заняли гарады Дорохой, Ботошаны и больш 350 других нас. пунктау, а таксама перарэзали чыгунку Яссы-Пашкани.

На Одэским напрамку нашы войски заняли чыгуначныя станцыи Выгода и Сартыровачная (5 клм. пауночней Одэсы).

На поунач ад Раздзельная нашы войски завяршыли ликвидацыю акружанай групироуки працивуника, якая складалася з астаткау 5–6 разбитых нямецких дывизий. Захоплены вяликия трофеи. Узята у палон 3.200 нямецких салдат и афицэрау, забита 7000 немцау.

РЭДКАЛЕГИЯ